ГЭТА ПРАЦУЕ

Як ідэя становіцца бізнесам

Дэпутаты Савета Рэспублікі знаёмяцца з работай кампаніі «J.T.Support me».

Гомельскі тэхнапарк зараз — быццам масток паміж навуковай сферай і рэальным сектарам эканомікі, выдатная стартавая пляцоўка, дзе чалавек у максімальна камфортных умовах можа рэалізаваць свае інавацыйныя ідэі і распрацоўкі.

На плошчы звыш 4 тыс. квадратных метраў у Гомельскім тэхнапарку цяпер працуе 18 рэзідэнтаў. Гэта арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі. Усяго 245 чалавек. У 2016 годзе тут было створана 114 новых працоўных месцаў. Сёння запоўненасць памяшканняў парка складае амаль 100%.

Заснавальнікам Гомельскага тэхнапарка з'яўляецца аблвыканкам. Адсюль вынікае, што тэхнапарк — дзяржаўная арганізацыя, якая ўяўляе сабою класічную мадэль бізнес-інкубатара еўрапейскага ўзора. Ідэі, якія ўвасабляюць у жыццё рэзідэнты, магчыма, у будучыні стануць пунктамі росту эканомікі.

Тэхнапарк займаецца падтрымкай інавацыйных праектаў у розных сферах: мікраэлектроніка, прыборабудаванне і шэраг іншых кірункаў. І ўсё ж найбольш актыўна тут развіваецца IT-сегмент. Каля 50% рэзідэнтаў Гомельскага тэхнапарка занятыя ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Сярод іх ёсць тыя, хто працуе на ўнутраны рынак, і тыя, хто накіраваны на экспарт.

Геаграфія экспарту рэзідэнтаў за час існавання парка ўключала: Вялікабрытанію, Ганконг, Італію, Літву, Малайзію, Польшчу, Расію, Славакію, ЗША, Тайвань, Турцыю, Украіну, Чылі, Паўднёвую Карэю. Статус рэзідэнта могуць атрымаць стартапы, або кампаніі, якія ўжо працуюць на рынку, а таксама індывідуальныя прадпрымальнікі. Максімальны тэрмін для рэалізацыі праекта — шэсць гадоў. Калі ідэя аказваецца вартай, то кампанія ці бізнесмен адпраўляецца ў вольнае плаванне. У выпадку правалу — пакідае сцены інкубатара. Па сусветнай статыстыцы, са 100% тых, хто рызыкнуў стварыць прыватную справу ў тэхнапарку, выжывае каля 80.

Дасягнутыя поспехі і вынікі можна ацаніць лічбамі. Як расказала **памочнік дырэктара ААТ «Гомельскі тэхнапарк» Алена МЯЛЕШКА,** па выніках работы за першае паўгоддзе 2017-га рэзідэнтамі экспартавана прадукцыі і паслуг на суму 2 136,91 тыс. руб. За паўгоддзе рэзідэнты, выплаціўшы падаткі, зборы і плацяжы, папоўнілі дзяржаўную казну на 912,86 тыс. руб.

Між тым дзейнасць Гомельскага тэхнапарка не абмяжоўваецца работай з яго рэзідэнтамі ў сценах будынка. Існуе мноства ідэй і праектаў. Напрыклад, плануецца спецыяльна для школьнікаў арганізаваць тэхнічныя цэнтры, гурткі, каб такім чынам стымуляваць займацца дакладнымі навукамі: матэматыкай, хіміяй, фізікай.

Развіваецца і супрацоўніцтва Гомельскага тэхнапарка з Гомельскім дзяржаўным універсітэтам імя Ф. Скарыны і Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам імя П. В. Сухога. На пастаяннай аснове студэнты гэтых ВНУ праходзяць вытворчую і пераддыпломную практыку ў кампаніях-рэзідэнтах. Дарэчы, навучальныя ўстановы выказваюць гатоўнасць карэктаваць вучэбныя праграмы зыходзячы з запатрабаванняў магчымых работадаўцаў. Акрамя таго, кампаніі-рэзідэнты арганізуюць для студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэтаў курсы ў сферы інфармацыйных тэхналогій.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

СВАЯ СПРАВА

«ВЕНЕРА» Ў ДАЛОНЯХ

Трымаць у далонях «Зорку Венеру»— звычайная справа для сямейнай пары з вёскі Карнюткі Валожынскага раёна. Мыла з такой назвай выпускае кампанія «Шляхетныя вырабы» пад брэндам «Каралі». Ранейшы сямейны бізнес ужо перарос у невялікую вытворчасць, а распаўсюджванне беларускай культуры стала сэнсам усёй справы.

Цяпер тут выпускаюць мыла і вырабы з фарфору. Ідэя прадукцыі — развіваць гонар за сваю гісторыю і культуру. Як гэта рабіць? Па-першае, ствараць якасныя беларускія рэчы. Па-другое, укладваць у іх сэнс. Так, многія жанчыны, мабыць, жадаюць адчуць сябе прыгажуняй Барбарай Радзівіл, якую кахаў кароль Жыгімонт II Аўгуст, нягледзячы на перашкоды сваякоў і рызыку страціць трон. А легенда пра Чорную панну Нясвіжа, якой стала Барбара пасля спроб вярнуць яе з таго свету, расказвае пра каханне без меж. Яна натхніла стварыць і духмянае мыла з такой назвай.

Віленскае барока таксама пакінула адметны след у архітэктуры Беларусі. Акрамя будынкаў у Вільні ў гэтым стылі створаны, напрыклад, Сафійскі сабор у Полацку і сабор Нараджэння Прасвятой Багародзіцы ў Глыбокім. І гэты напрамак таксама знайшоў адлюстраванне ў назвах прадуктаў серыі «Каралі». Яшчэ адзін прыклад — «Цуд на Каляды». Ці можа ён здзейсніць мару? Невядома. Але паспрабаваць варта.

— Мы падкрэсліваем, што ёсць пэўныя традыцыйныя каштоўнасці для беларусаў, якія мы хацелі б несці ў масы. Гэта ў першую чаргу для нас — каб памятаць сваю гісторыю, у другую чаргу — для турыстаў, якія знаёмяцца з нашай краінай, у тым ліку праз нашы прадукты, — расказвае **дырэктар кампаніі Сяргей СЕМЯНЮК.**

Мыла робяць невялікімі партыямі ўручную з раслінных алеяў. Ёсць і другі напрамак вытворчасці — фарфор. Яго выбралі невыпадкова: наборы з імбрыка, кубкаў, сподкаў, сальніцы, перачніцы, вазы і мыльніцы таксама звязаны з нашай культурай: на іх — выявы зброі часоў Вялікага Княства Літоўскага і выцінанак. «Мы шукалі нейкія з'явы беларускай гісторыі, вельмі характэрныя для беларусаў, якія павінны выклікаць пэўны гонар. І адпаведна ВКЛ — гэта адна са старонак гісторыі, якая можа выклікаць гэта пачуццё. Мы спрабавалі яе нейкім чынам праілюстраваць на нашых прадуктах», — тлумачыць суразмоўнік.

Месца пад Валожынам выбралі за прыгожыя краявіды і вельмі характэрную для Беларусі прыроду. Не так даўно набылі ва ўласнасць будынак былой школы. Ён яшчэ рэстаўрыруецца, і ў выніку там будуць знаходзіцца і вытворчасць, і працоўныя пакоі для рамеснікаў. А сам будынак стане сацыяльна-культурным аб'ектам — месцам прыцягнення для турыстаў з усёй Беларусі і замежнікаў. Суразмоўнік спадзяецца, што бізнес будзе пашырацца, а разам з гэтым створацца і новыя рабочыя месцы.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

За першае паўгоддзе ў Валожынскім раёне з'явілася 46 новых індывідуальных прадпрымальнікаў і зарэгістравана 18 новых юрыдычных асоб. Іх асноўны від дзейнасці — гандаль і аказанне паслуг. Увогуле, паводле статыстыкі, за першы квартал гэтага года ў раёне ўласным бізнесам займаюцца каля 530 ІП і 390 юрасоб.

Па словах **галоўнага спецыяліста аддзела эканомікі Валожынскага райвыканкама Ядвігі ТУМЕЛЬ,** з кожным годам колькасць прадпрымальнікаў павялічваецца. Працэс рэгістрацыі даволі просты: трэба падаць заяву і аплаціць дзяржпошліну. І ў той жа дзень бізнес будзе афіцыйна зарэгістраваны. Для беспрацоўных цэнтр занятасці выдзяляе бязвыплатныя субсідыі. Да таго ж у райвыканкаме можна атрымаць кансультацыю па юрыдычных аспектах адкрыцця сваёй справы.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62.

Продавец: Общество с ограниченной ответственностью «Полоцкая строительная компания», 211400 Витебская обл., г. Полоцк, ул. Суворова, д. 64, 8 (029) 219-07-93

Лот №1. Капитальное строение с инв. №250/С-43103 площадью 1039 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Полоцкий район, г. Полоцк, ул. Суворова, 64, наименование – стоянка автотранспортная, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, на земельном участке с кадастровым номером 243500000005002005 площадью 0,1519 га. Составные части и принадлежности: стоянка автотранспортная. **Начальная цена:** 41 840 руб. без НДС. **Задаток:** 4 184 руб.

Дата, время и место проведения аукциона: 19.09.2017 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах с 16.08.2017 с 8.30 по 18.09.2017 до 17.30. Сумма задатка перечисляется на р/с BY55BAPB30124514600120000000 в ОАО «Белагропромбанк» Витебское областное управление г. Витебск, БИК BAPBBY22424, УНП 390455266. Получатель платежа: ООО «Полоцкая строительная компания». **Условие аукциона:** оплата НДС в размере 20% от цены продажи имущества

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в размере 20% от цены продажи имущества в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00.

Контактные тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

Продавец: ОАО «Витебскоблавтотранс» (Филиал «Автотранспортное предприятие №18» г. Браслав»), 211970, Витебская обл., г. Браслав, ул. Юбилейная, 99, тел. (+37533)345-11-39

Лот №1. Капитальное строение с инв.№ 210/С-8858 по адресу: Витебская обл., Браславский район, г. Браслав, ул. Промышленная, 11, площадью 57,7 кв. м, назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – автозаправочный пункт; капитальное строение с инв. №210/С-8859 по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, г. Браслав, ул. Промышленная, д. 11, площадью 306 кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – открытая площадка для хранения горюче-смазочных материалов. Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 220850100002000035 площадью 1,2160 га, назначение: земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в т. ч. автомобильных заправочных и газонаполнительных станций). **Начальная цена:** 62 392,50 без НДС. **Задаток:** 6 239,25 руб.

Повторный аукцион состоится 18.09.2017 в 12.00 по адресу: Витебская обл., г. Браслав, ул. Юбилейная, 99 в филиале «Автотранспортное предприятие №18 г. Браслава» ОАО «Витебскоблавтотранс». Срок внесения задатков и приема документов: с 16.08.2017 с 8.30 по 15.09.2017 г. до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Ранее опубликованные извещения в газете «Звязда» за 17.03.2017, 06.05.2017, 24.06.2017

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с BY93MTBK30120001093300066782, ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

Дополнительную информацию можно получить по тел.:
(0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by